# Ад Сожа да Буга

У Гомельскім абласным музеі ваеннай славы адкрыта выстаўка «Ад Сожа да Буга» мастака, пісьменніка Ю.В. Рахоўскага (1923-2006 гг.). Юрый Рахоўскі - удзельнік вы-звалення Беларусі, у тым ліку і Го-мельшчыны, ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце начальнікам разведкі 13-й Брэсцкай Чырвонасцяжнай ордена Кутузава лёгкай артылерыйскай брыгады 22-й Гомельскай Чырвонасцяжнай арденоў Суворава, Кутузава і Багдана Хмяльніцкага артылерыйскай дывізіі прарыва рэзерву Вярхоўнага Галоўнакаман-давання.

Пасля вайны скончыў Усесаюзны інстытут кінематаграфіі і ваенную акадэмію імя М.В. Фрунзе, стаў падпалкоўнікам, працаваў у многіх маскоўскіх выдавецтвах, напісаў трохтомны раман «Апошнія дні лета» і аповесць «Дарога». Мастак стварыў шмат работ, у якіх асобнае месца займае тэма Вялікай Айчыннай вайны.

Ветэраны 22-й артылерыйскай Гомельскай чатырыжды ардзнанос-най дывізіі прарыву РГК, якая ў лістападзе 1943 г. вызваляла Гомель-шчыну ад гітлераўскіх захопнікаў, неаднаразова наведвалі Гомель у пасляваенныя гады. У адну з такіх сустрэч Юрый Рахоўскі перадаў гамяльчанам больш за 30 сваіх ра-бш; Тіамаляваных ім на фронце і ўканцы 1970-х-пачатку 1980-х гадоў. Зробленыя ім франтавыя замалёўкі батальных і жанравых сцэн, пар-трэты, выкананыя з натуры і па асабістых уражаннях мастака, які непасрэдна ўдзельнічаў у баявых аперацыях, уяўляюць гістарычную і мастацкую каштоўнасць. Ало-вак і папера былі на фронце яго пастаяннымі спадарожнікамі.



Мастак стварыў своеасаблівы летапіс 22-й артдывізіі прарыву РГК, якая дзейнічала ва ўсіх буйнейшых аперацыях Беларускага фронту.

На выстаўцы таксама прадстаўлены фатаграфіі байцоў і камандзіраў дывізіі, іх дакументы, асабістыя рэчы, узнагароды, зброя.

Выстаўку адкрывае акварельная работа «Пад Веткай». У ходзе Гомельска-Рэчыцкай наступаль-най аперацыі, якая пачалася 10 лістапада 1943 г. у раёне Веткі, 11-я армія пры падтрымцы 22-й артылерыйскай дывізіі палкоўніка К.І. Каралёва на ўчастку Старое Сяло-Хальч фарсіравалі Сож і ўступілі ў бой на заходнім беразе ракі. На малюнку паказаны эпізод бою за Гомель, калі назіральны пункт 13-й лёгка-артылерыйскай брыгады быў размешчаны ў Старым Сяле, куды прыбыў камандуючы артылерыяй Беларускага фронту генерал-палкоўнік В.І, Казакоў.

Потым былі баі за Мазыр і Калінкавічы, якія мастак увасобіў у работах «Прыстрэлка» і «На Мазыр». За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць дывізія была ўзнагароджана орденам Чырвонага Сцяга.

Летам 1944 г. пачалася падрыхтоўка вялікай наступальнай аперацыі. На выстаўцы

прадстаўлена работа мастака «Заўтра - «Баграціён», на якой назіральны пункт 13-й лёгка- - артылерыйскай брыгады размясціўся ў лесе на ўсходнім беразе ракі Друць, дзе дывізія ў саставе войск 1-га Беларускага фронту прарвала доўгачасовую абарону ворага.

Затым - вызваленне Бабруйска, Пра гэта сведчаць творы «Бабруйскі кацёл», «Прарыў», «Танкі злева», «Капі канчаюцца снарады». Малюнак «Рускае поле», якое знаходзіцца на паўночным захадзе ад Бабруйска, мастак маляваў алоўкам спяшаючы-ся, таму што брыгада атрымала ўжо прыказ на перадыслакацыю ў раён Слуцка для працягу наступления ў Бресцкім накірунку.

Артылерыйская дывізія - гета гарматы, цягачы, кухні і нават свая дывізійная газета, але галоўнае -гета людзі. На выстаўцы ім удзелена асаблівая ўвага. Перад намі паўстае галерея вобразаў салдат і афіцераў, з кім лёс звёў Юрыя Рахоўскага ў гады вайны.

28 червеня 1944 быў вы-звалены апошні абласны центр рэспублікі - Брест. Асабістаму саставу дывізіі загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага была аб'яўлена падзяка, а дзве брыгады - 13-я лёгка-артылерыйская і 63-я гаўбічна-артылерыйская сталі называцца «Брзсцкімі».

«За Бугам - чужыя гарады» - работа, якая завяршае выстаўку, прысвечаную вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Наперадзе, за Бугам, былі гарады Польшчы, Усходняй Прусіі, Германіі...

І колькі б ні прайшло часу, творы Ю.В. Рахоўскага пра вайну заўсёды застануцца актуальнымі для беларусаў, бо з'яўляюцца своеасаблівым помнікам нашай Перамогі.